*Т. Я. Старасценка (Беларусь)*

# ЭКСПЛІКАЦЫЯ СЭНСАВЫХ АПАЗІЦЫЙ У ПАЭТЫЧНЫМ ДЫСКУРСЕ ПЕТРУСЯ БРОЎКІ

Дамінантнымі сэнсавымі апазіцыямі паэтычнага дыскурсу Петруся Броўкі з'яўляюцца **«жыццё – смерць»**, **«святло – цемра»**, **«цяпло – холад»**. Мэта гэтага артыкула – прааналізаваць сродкі іх рэпрэзентацыі.

Найбольш аб'ёмнай па колькасці вербалізатараў выступае апазіцыя **«жыццё – смерць»**, якая ўключае тэмпаральную *прошлы час/цяперашні час*. Футуральны план твораў П. Броўкі мадэлюе шчаслівую будучыню і выводзіцца на аснове прэтэрытальнага і прэзентнага, у якіх самым дарагім чалавекам для лірычнага «я» выступае мама. Дынамічная сістэма дзеяслоўных формаў фарміруе вобраз маці з семамі 'чаканне' ў цяперашнім: *чакае маці* («Дахаты») і 'сустрэча' ў будучым ірэальнай мадальнасці: *выходзь сустракаць*; *сыноў прывітай*; *стол накрывай абрусамі* («Роднае»). Асіметрыя мінулага паэмы «Голас сэрца» рэалізуецца праз яго кантрасныя семы 'радасць' – 'пакута'. Жахлівую смерць маці ад рук фашыстаў эксплікуюць дзеясловы закончанага трывання з канкрэтна-фактычным значэннем: *Маці! І тут табе быць давялося, / Колькі тваёй тут крыві пралілося*. Шчаслівае мінулае вербалізуюць у творы дзеясловы незакончанага трывання з агульнафактычным выніковым значэннем: *ты пякла нам аладкі*; *як ты спявала, як прала, як жала, як шыла кашульку, як вышывала*; *як пахлі рукі твае лебядою*; *як яны нас абдымалі і грэлі*; *як твае вочы ласкава глядзелі*. Сема жыцця вобраза маці працягваецца ў цяперашнім абстрактнага назоўніка *мара*: *А ты ж – толькі ў марах*, канкрэтнага назоўніка *помнік*: *Помнік на ўзгорку ля вёскі сягоння* і ўключаецца ў шырокі кантэкст жыцця: *Сонечны ранак над хатамі грае*. Супрацьпастаўленне прошлага і цяперашняга гістарычнага з семантыкай вайны і міру адлюстроўвае адносіны лірычнага героя да Бацькаўшчыны і характэрна для верша «Мінск». Паслядоўнасць дзеянняў цяперашняга гістарычнага *праходжу*, *гляджу*, *збіраю*, *іду*, *устае*, *расце* рэпрэзентуе эмацыянальны стан лірычнага «я» – суб'екта руху і назірання, які, паступова зліваючыся з горадам, становіцца складаным дзейнікам: *Я рады. / Я з горадам разам жыву*. Тэмпаральны план мінулага семантыкі гора і разбурэння вербалізаваны словазлучэннямі з дзеепрыметнікамі залежнага стану: *знішчаны сад*; *разбітыя вуліцы*; *абвугленыя дрэвы*; з *прасцёртымі ў дыме рукамі*; *аблітая слязамі*; *разбітыя вайною дарогі*; *распятыя жудасным крыкам*, якія ствараюць экспрэсіўны вобраз вайны. У вобразе Радзімы парадыгматычны кантраст актуалізуе парадыгму мінулага з семантыкай вайны: *гора*; *раны*; *пажары*; *бомбы*; *слёзы* («А помніш, мой дружа!»); *кроў*; *грозныя, чорныя гады*; *дым уедлівы, горкі*; *змаганне цяжкое* («Франтавыя дарогі») і цяперашняга з семантыкай міру. Яго ключавымі эксплікантамі выступаюць *магіла і памяць*: *Толькі ў нас ты жывы, / Ты не можаш маўчаць* («Са Стакгольмскага сшытка»). Форма ў *нас*, выяўляючы «сінкрэтызм асабовага займенніка» [2, с. 81], імплікуе дастойны працяг жыцця – не фізічнага, а вечнага, духоўнага, таму магіла і памяць сінанімізуюцца. Як і ў вершы «Магіла невядомага салдата»: *Аб ім хаты новай вёскі назаўсёды помняць, / Аб ім хвалі быстрай рэчкі дзень і ноч гамоняць*, дзе паралелізм канструкцый збліжае формы множнага ліку чалавечага (хаты) і прыроднага (хвалі рэчкі) з прэзенсам у семе 'працяг жыцця'. Існуе думка, што «назоўнікі і дзеясловы павінны арганізоўвацца на лексічным узроўні» [1, с. 85]. Такая арганізацыя ў адносінах да паэтычнай структуры, на наш погляд, засноўваецца на паралелізме, які дазваляе, як у прыведзеным прыкладзе, супаставіць розныя па значэнні словы. У жыццесцвярджальнай эксплікацыі П. Броўкі важнае значэнне набывае кальцавая кампазіцыя, дзякуючы якой актуа-

лізуюцца два тэмпаральныя планы – футуральны і прэзентны. Прэзентны вербалізуюць іменныя прэдыкаты з семантыкай жыцця: *Мне ўсё дорага тут* («Спатканне»); *Ты жывы сягоння, наш Купала!* («Не паверу смерці»), футуральны – індыкатывы са значэннем неперараможнасці: *І выйдзе Беларусь з палону!* («Маці»); *Будзем сеяць, беларусы!* («Будзем сеяць, беларусы!»). У паэме «Беларусь» фарміраванню стылістычнай кагезіі спрыяе зваротак *Зямля Беларусі!*, які парадыгматычна звязвае мінулае і цяперашняе Бацькаўшчыны. Сэнсавая інверсія абодвух тэмпаральных планаў звязана з іх прыналежнасцю як да міру, так і да вайны. Асаблівую экспрэсію набывае мінулае ваеннага ліхалецця ў паралелізме сінтаксічных канструкцый, дзе гукавое падабенства рыфмы *смерці – дзеці* сэнсава збліжае кантрасныя па сваёй сутнасці паняцці: *Як нішчылі вуліцы выбухі смерці, / Як чэзлі ў руінах забітыя дзеці*. Мінулае міру звязана ў П. Броўкі з таленавітымі асобамі Купалай, Коласам, Багдановічам, Цёткай, прычым адзіночны лік таленту ўключаецца ў інклюзіўную прыналежную і асабовую форму займенніка *мы*: *А як разгарнуўся* ***наш*** *росквіт вялікі / У дні* ***нашай*** *бурнай, прыгожай вясны. /* ***Мы*** *радасным песням не ведалі ліку і* множналікавую назоўнікавую *Раслі* ***спевакі, песняры і музыкі***. У плане цяперашняга сема жыцця вынікае з кантраснага кантэксту дэтэрмінантаў семантыкі смерці: *Зямля Беларусі!* ***У гуле і звоне*** */ Сягоння ўздымаешся вольнаю ты*; *Зямля Беларусі!* ***Ў часіны нягоды*** */ Тваіх абаронцаў нязломная раць*; ***Праз буры-віхуры і снежную замець*** */ Гвардзейцаў праходзяць палкі за палкамі* і набывае актыўнасць у акцыянальных дзеясловах.

Пры разглядзе сэнсавай апазіцыі **«святло – цемра»** варта адзначыць, што ў цэлым для ідыястылю П. Броўкі характэрна найбольшая актуалізацыя кампанента *святло* як у прэзенсе, так і ў назоўнікавых лексемах. Нават кантрасны вобраз набывае ў паэта істотную ў колькасных адносінах парадыгму пазітыўнаацэначных рэпрэзентантаў. Як, напрыклад, у вершы «Вясна», дзе першая тэматычная лінія «Змрочная восень» супадае з адным фрагментам, другая тэматычная лінія «Светлая восень» аб’ядноўвае чатыры фрагменты, апошні з якіх заканчваецца пераходам прыроднага плана ў інтраспектыўны праз прыналежны займеннік: *Я сваю вітаю восень!* Кантраст дабра і зла адлюстроўваецца ў трох фрагментах верша «Сэрца» праз паралелізм знешняга і інтраспектыўнага, якія парадыгматычна кантамінуюцца ў дзеепрыметніку *пераажыта*. Супрацьпастаўленні *хмурыя – ясныя*, *моры – горы*, *дрэўцы – камень* вербалізуюць унутраны стан лірычнага «я», здольнага да перамог: *Кідаюся хворы на ложку праз ночы, / Але з перамогай страчаю світанне*. Злучнік *але* пераводзіць увагу чытача ў іншы сэнсавы план з парадыгмай лексем семантыкі шчасця: *світанне*, *бадзёры*, *дужы*, *сяброўства*. Узнікае сэнсавае прырашчэнне моцы чалавечага духу. Эксплікацыя святла дазваляе кантамінаваць кампаненты апазіцыі *адзінкавасць/множнасць у* назоўніку *кропля*: *Колькі ў кроплю / Фарбаў назаткана, / Быццам свет увесь у ёй сабраны: / Поле, / Луг, / Сады ўсяго пасёлка, / І рака, / І неба, / І вясёлка!* («Кропля»). Лірычны герой П. Броўкі можа радавацца кожнай праяве знешняга свету, што выражае рэфрэн *шчасце!* аднайменнага верша – тэма, якая разгортваецца праз рэмы аб’ектаў рэчаіснасці цяперашняга пастаяннага.

У сэнсавай апазіцыі **«цяпло – холад»** рэалізуецца градуальнасць, якая можа мець усечаны характар, як у вершы «Над возерам»: *вясна – восень – зіма – вясна з* кальцавой кампазіцыяй вобраза вясны, што пацвярджае перавагу семантыкі абуджэння. Менавіта кальцавая кампазіцыя нясе ў сабе асаблівы мастацкі сэнс, паколькі праз кампазіцыйную тоеснасць пачатку і канца чытач акцэнтуе ўвагу на самых значных момантах паэтычнага светаўспрымання. «Тэксты, перадаючы пэўныя значэнні, выкарыстоўваюцца для камунікацыі паміж адпраўнікам і атрымальнікам» [3, с. 288]. Камунікатыўны эфект каль-

цавой кампазіцыі заключаецца ў счапленні найбольш актуальных для аўтара вобразаў, якія дазваляюць чытачу адэкватна дэкадаваць сэнс. Пеяратыўны характар холаду эксплікуюць словазлучэнні *злосная мятлюга*, *шчыплецца да слёз з* экспрэсіяй марознай непагадзі («Белы барабаншчык»). Мароз набывае рысы ўвасаблення ў тройчы паўтораным словазлучэнні *белы барабаншчык*, у атрыбутыўных словазлучэннях *белая світа*, *зорная шапка*, *калючая барада*, *доўгія рукі*. Пашыраная градуальнасць рэалізуецца ў вершы «Трубі, мой бор…»: *вясна – лета – восень – зіма* і эксплікуецца ў чатырох фрагментах, аб’яднаных агульным рэфрэнам. Ядзерныя структуры фрагментаў – *Ах, каб ты ведаў, як прыемна / З табою стрэнуцца вясной*; *Люблю цябе спякотным летам*; *Люблю з табою я размовы ўвосені*; *Люблю зімой, такімі днямі, / Калі цябе агорне ціш* – дазваляюць уявіць ланцужковую сувязь паміж імі. У сінтагматычнай паслядоўнасці фрагменты фарміруюць уяўленні-вобразы з семантычнай тоеснасцю, паколькі эксплікуецца пазітыўнаацэначная інфармацыя. Аднак найбольшую блізкасць да лірычнага «я» набываюць вясеннія вобразы бору праз творны сустрэчы з *табою стрэнуцца і* генітыў захаплення: *Калі пралеска сінім вокам / Кранецца самае душы*. «Я» ўключаецца ў аб’ект як яго частка праз тэма-рэматычныя адносіны: *Ты – мой сапраўдны родны дом*. У іншых фрагментах рэляцыйная пара «я» – «ты» набывае суб’ектна-аб’ектныя адносіны, калі «я» становіцца сузіральнікам і праз трапеічныя сродкі фарміруе вобраз адасобленага «ты». Найменшая градуальная ўсечанасць характэрна для верша «Вось і лета сышло…»: у яе фарміраванні ўдзельнічаюць два кампаненты *лета – восень*. У вобразе лета актыўнасць набываюць суб’ектна-прэдыкатныя адносіны: *Вось і лета сышло, / Адспявалі калоссі*, а нечаканае з’яўленне восені рэпрэзентуецца творным склонам аб’екта з дадатковым адценнем разнастайнасці пры метафарычных дзеясловах: *прыплыве павуцінкай*; *гляне жоўтым лістком*; *усплыве туманом*; *устрывожыць дымком*; *зачаруе агнём*; *памахае крылом*.

Такім чынам, сэнсавыя апазіцыі як пазатэкставыя асацыяцыі рэпрэзентуюцца ў паэтычным дыскурсе Петруся Броўкі не толькі праз трапеічныя сродкі, а і праз граматычныя: тэмпаральныя супрацьпастаўленні, дзеяслоўныя формы, катэгорыі ліку, склону, тэма-рэматычныя адносіны.

**Літаратура**


1. Błaszczak, J. Noun and verb in the mind. An interdisciplinary approach / J. Błaszczak, D. Klimek-Jankowska // How categorical are categories? / ed.: J. Błaszczak [et al.]. – Berlin ; Boston : De Gruyter Mouton, 2015. – XII, P. 75–112.
2. Kucała, M. Rodzaj gramatyczny w historii polszczyzny / M. Kucała. – Wrocław : Ossolineum, 1978. – 194 s.
3. Mazurkiewicz, A. Ordering of texts by contents / A. Mazurkiewicz // Quantification, temps, aspects / Instytut Slawistyki Polskiej Academii Nauk. – Warszawa : SOW, 1999. – P. 287–303.



*В. Д. Старычонак (Беларусь)*


# ФУНКЦЫЯНАВАННЕ ДЗЕЯСЛОВАЎ РУХУ Ў МАСТАЦКА-ПУБЛІЦЫСТЫЧНЫМ ДЫСКУРСЕ (НА МАТЭРЫЯЛЕ ДЗЕЯСЛОВА *ІСЦІ*)

У ліку актуальных праблем, якія разглядаюцца айчыннымі і замежнымі лінгвістамі, знаходзіцца праблема функцыянавання дзеясловаў руху, перамяшчэння ў прасторы. Гэтыя дзеясловы па прычыне выражэння імі асноўнай і найважнейшай формы існавання матэрыі займаюць цэнтральнае месца ў лексічнай сістэме любой мовы. Сярод дзеясловаў руху найбольш ёмістая сэнсавая структура выяўлена ў дзеяслова *ісці*, своеасаблівая суперпарадыгма (звышпа-